

Download



"Вясна" назірае

⚡⚡⚡**Пяць чалавек у адным карцары, на суд — у кайданках. Былому міліцыянту Емяльянаву ўжо двойчы прысудзілі "суткі"**

20 траўня затрымалі **былога міліцыянта Ягора Емяльянава**, які адмовіўся ў жніўні ўдзельнічаць у падаўленні пратэстаў у Наваполацку і звольніўся з міліцыі. За тыдзень да затрымання Ягор даў інтэрв'ю TRIBUNA.BY, а 19 траўня на "Белсаце" выйшаў відэаматэрыял пра сілавікоў, у якім Ягор таксама прыняў удзел. Ужо 20 траўня супрацоўнікі міліцыі прышлі па Ягора на яго працоўнае месца — у сталічны фітнэс-цэнтр.

21 траўня прайшоў першы суд над Емяльянавым у судзе Савецкага раёна. Справу разглядзеў суддзя Сяргей Шаціла, але пасля заканчэння працоўнага дня — **у 18:10**.

Па словах Ягора, у 18:00 яго чакаў кліент на запланаванай трэнеровцы, але два супрацоўнікі ў цывільным сарвалі яе, "прапанаваўшы" праехаць з імі ў Савецкі РУУС для "**ўдакладнення нейкіх дадзеных па яго фотаробату**". Пасведчанне паказаў толькі адзін з іх — **супрацоўнік наркакантролю**.

Але ва ўпраўленні супраць мужчыны склалі пратакол **па арт. 19.1 КаАП**, згодна з якім 20 траўня Ягор "у 18:00 каля крамы "Суседзі" наўмысна з хуліганскіх памкненняў абразліва чапляўся да грамадзян, нецэнзурна лаяўся ў іх адрас, на заўвагі не рэагаваў, чым парушыў спакой грамадзян".

На думку аднаго з міліцыянтаў, якія выступілі на судзе ў якасці сведак, **непадпарадкаванне Ягора доўжылася менш за хвіліну**. Сведка нават не чуў ніякіх выказванняў з боку затрыманага, але дакладна памятае, што яны былі нецэнзурныя🤦

У выніку, **суддзя Шаціла арыштаваў экс-міліцыянта на 15 сутак**, адхіліўшы ўсе хадайніцтва адваката.

Але **24 траўня** справа Емяльянава зноў з'явілася ў раскладзе суда. На гэты раз яе разглядала **суддзя Алена Жуковіч**. Суд пачаўся пасля заканчэння працоўнага дня:
— Судовае паседжанне працягнутае. Што гэта ў Вас на руках?
— Кайданкі.
— У сувязі з чым?
— У сувязі з тым, што я былы супрацоўнік. Яны палічылі, каб я больш памучаўся…

Суддзя Жуковіч абурылася і паклікала супрацоўнікаў РУУСа, каб яны знялі іх на час судовага працэсу.

Новы пратакол па арт. 24.3 КаАП на экс-міліцыянта склалі 20 траўня ў 18:20, то бок праз 20 хвілін пасля першага "правапарушэння". Па пратаколе, "будучы ўжо затрыманым, Емяльянаў адмовіўся прайсці ў Савецкі РУУС і спрабаваў уцячы, чым аказаў непадпарадкаванне супрацоўніку міліцыі". Па словах Ягора, ён нават не ведаў, што быў затрыманы амаль да прыезду ў ЦІП на Акрэсціна.
Віны сваёй ён не прызнаў і дадаў:
— Я 17 гадоў служыў у міліцыі і ведаю, што можа быць за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі, таму я гэтага не здзяйсняў.

Context
Embed
View in Channel
<script async src="https://telegram.org/js/telegram-widget.js?
Copy

🤡Сведка-міліцыянт, як заўсёды, распавядаў пра тое, што быў у форменным абмундзіраванні і аб нязгодзе затрыманага прайсці за ім у будынак РУУСа. Паказанні Емяльянава кардынальна адрозніваюцца ад паказанняў сведкі.

...лучэнні відэа, на якім відаць, што ў паказаны час Ягор разам з людзьмі ў ...вотна, не здзяйсняючы хуліганства. **Суддзя Жуковіч адхіліла хадайніцтва, палічыўшы, што яно не адносіцца да справы.**

👩‍⚖️Для суддзі Жуковіч доказаў у матэрыялах справы аказалася дастаткова, таму яна асудзіла Емяльянава яшчэ **на 15 сутак**. Агулам экс-міліцыянт правядзе за кратамі 30 сутак.

‼️Таксама стала вядома, што Ягора змясцілі ў бетонны карцар, у якім акрамя яго сядзяць яшчэ чатыры чалавекі.

BY.Tribuna.com
Этот качок после выборов ушел из милиции, чтобы остаться за народ, а теперь лишился звания – поговорили о его новой жизни, непонимании…
Совесть для ныне фитнес-тренера Егора Емельянова важнее кредитов.
t.me/viasnanazirae/331
9.1K viewsedited May 24, 2021 at 19:26